УДК 94 (478)

# Чалавек у гісторыка-культурным працэсе ў Беларусі XVII-XVIII ст. (на матэрыялах мемуарных крыніц)

**І.Р. Вуглік**
*Прыватная установа адукацыі “Інстытут сучасных ведаў імя А.М. Шырокава”*

*У артыкуле І.Р. Вугліка “Чалавек у гісторыка-культурным працэсе ў Беларусі XVII-XVIII ст. (на матэрыялах мемуарных крыніц)” разглядаюцца пытанні стылістыцы бытавых паводзін, успрыяцця челавекам гісторыка-культурных рэалій Беларусі XVII-XVIII ст. На матэрыялах мемуарных крыніц, шэраг з якіх паходзяць з радзівілаўскага архіўнага фонда і ўпершыню уводзіцца ў навуковы абарот, даследуецца асаблівасці тагачаснага бытавога, будзённага жыцця, а таксама спецыфіка яго адлюстравання ў прыватных запісах. Вылучаюцца пэўныя гісторыка-бытавыя тыпы, разглядаюцца адметныя рысы іх бытавых паводзін. Адзначаецца падзейная насычанасць тагачаснага жыцця, увага да фіксацыі будзёных жыццёвых падзей. Прасочваюцца змены ў светаўспрыманні чалавекам навакольных падзей, звязаныя з паглыбленнем эмацыянальнага пачатка, аксіялагічнай кампаненты. Дадзеныя з’явы уводзяцца ў кантэкст агульных культурных тэндэнцый еўрапейскай, беларускай культур часоў барока і суадносяцца з агульнаеўрапейскім працэсам развіцця індывідуалізму.*

***Ключавыя словы****: гісторыя, культура, гісторыка-культурны стыль, асоба, мемуарная літаратура, гісторыка-культурны працэс.*

# Person in the historical and cultural process in Belarus of 17-18 centuries (on the materials of memoirs)

**I.G. Vuhlik**
*Private owned educational establishment “Institute of modern knowledge named after A.M.Shirokov”*

The article of I.G. Vuhlik “Person in the historical and cultural process in Belarus of 17-18 centuries (on the materials of memoirs)” considers the issues of the stylistics of household behavior, the perception by man of the historical and cultural events in Belarus of that period. On the basis of memoir sources, some of which are from Radzyvil archive and are presented for the first time, peculiarities of everyday household life of that period are studied as well as the way this life was depicted in private papers. Distinct historical and household types are identified, peculiar features of their household behavior are considered. Concentration of events of that period of life is singled out as well as attention to noting down everyday events. Changes in man’s outlook of the surrounding events connected with the deepening of the emotional or axiological component are traced. The given phenomena are introduced into the context of general cultural tendencies of European and Belarusian cultures of Barocco times; they are correlated with the general European process of the development of individualism.

*Key words*: history*, culture, historical and cultural style, personality, memoir literature, historical and cultural process*

Вывучэнне грамадскай псіхалогіі і свядомасці, пачуццяў і думак, духоўнага жыцця, “ментальнасці” людзей як істотнай часткі гістарычнага даследавання атрымала развіццё і прызнанне ў французскай школе “Аналоў” (М. Блок, Л. Феўр) [1, с.198-204]. Гісторыі нашай культуры часоў старажытнай Рэчы Паспалітай у значнай ступені праходзіла пад знакам экспансіі індывідуалізму, працэсаў нарастання асабістага пачатку, развіцця рэфлексіі асобы, што вызначае актуальнасць гэтай гістарычнай метадалогіі і праблематыкі. Дадзена тэматыка мае істотны гістарычны, культурна-бытавы аспект, бо дазваляе зрабіць рэканструкцыю будзёнага жыцця чалавека ў пэўную гістарычную эпоху, паказаць гістарычны працэс знутры, даследаваць тое, з чаго ен складаецца – жыццё

канкрэтных людзей, яго стылістыку і праблематыку, гісторыка-рныя бытавыя тыпы з характэрнымі для іх паводзінамі, светаўспрыманнем. Істотнай крыніцай для рэканструкцыі індывідуальнага жыцця чалавека з'яўляюляецца мемуарная літаратура, уздым якой у Еўропе, у тым ліку і на беларускіх землях прыйшоўся на XVII-XVIII ст. Гэты від крыніц, побач з лістамі, рэпрэзентуе найбольш інтымны, індывідуалізаваны тіп жыцця, светаўсарымання. Праблема чалавека ў гісторыка-культурным працэсе на матэрыялах мемуарнай літаратуры часоў старажытнай Рэчы Паспалітай вывучалася А. Мальдзісам [2, с. 80-123], іншымі навукоўцамі, таксама аўтарам артыкула [3; 4]. Разам з тым, для яе даследавання важнай з'яўляецца апрабацыя новых крыніц і даследчыцкіх аспектаў, што з'яўляецца мэтай дадзенага артыкула.

**Матэрыялы і метады**. Метадалагічную і метадычную асновы артыкула складаюць гістарычны, тыпалагічны, структурны канцэпты, методыка гістарычнага, культуралагічнага даследаванняў.

Развіццё індывідуалізму, увага да падзейнага боку індывідуальнага існавання з'яўляюцца ў гісторыі еўрапейскай культуры адным з фундаментальных культурных вектараў, які яскрава праявіўся ў культуры рэнесансу і барока. Яго паказчыкам з'явілася распаўсюджванне ў XVII-XVIII ст. такіх эпісталярных жанраў, як "партрэты", "характары", мемуары, лісты, да якіх потым дадаліся інтымны дзённік і аўтабіяграфічная проза. Ва ўсходнееўрапейскім, пераважна славянскім культурным рэгіёне, у тым ліку і ў Польшы, ў літаратуры ішлі аналагічныя працэсы, звязаныя з інтымізацыяй, індывідуалізацыяй твораў [5, с. 264-319]. На беларускіх землях Рэчы Паспалітай, Вялікага Княства Літоўскага працэс індывідуальнай фіксацыі падзей выразна праявіўся ў гісторыка-мемуарнай прозе, якая пачала зараджацца ў шляхецкім асяроддзі з другой паловы XVI ст. і набыла форму "дыярыюшаў", успамінаў, якія досыць часта грунтаваліся на радавых дзённіках. А. Мальдзіс, адзначае, што для мемуарнай прозы XVII ст. галоўным аб'ектам увагі была падзея, прычым асоба аўтара, яе ўспрыманне свету і ўнутраныя пачуцці паказваліся досыць рэдка, "падзейнасць" была ўласцівая і шматлікім дзённікам, успамінам наступнага стагоддзя, хаця ў гэты час з'яўляюцца творы з выразнымі суб'ектыўнымі, інтымным пачаткам [2, с. 38, 41, 42, 73, 75]. Адзначым, што суб'ектыўны пачатак праяўляўся ў асноўным у апісанні падзей асабістага жыцця, ён у меншай меры распаўсюджваўся на ацэнку гістарычных падзей, значных асоб (за выключэннем успамінаў М. Матушэвіча, Л. Цяшкоўскага, А. Ельскага).

Характэрнай рысай мемуарнай літаратуры на нашых землях XVII ст. з'яўляецца падрабязная, штодзённая канстатацыя падзей амаль без іх аксіялагічнай адзнакі. Гэта сустракаецца параважна ў запісах службовых асоб, іх дыяпазон ахоплівае сферу службовых абавязкаў, у цэнтры – постаць патрона. Гэты тып бытавых паводзін – таксама адзін з мадэльных на нашых землях, дзе вялікая колькасць шляхты была заняты службовымі абавязкамі. Сама па сабе пільная ўвага да будзёных падзей кожнага дня сведччыць аб поглядзе на жыццё як на падзейны, самакаштоўны працэс, дзе "малая гісторыя" асобнага чалавека злучаецца з больш значнай гістояй жыцця яго патрона. Гэта тычыцца фрагмента ананімнага дыярыюша, хутчэй за ўсё XVII ст., напісанага па польску набліжаным князя Радзівіла, у якім пераважала знешняя канстатацыя падзей [3, с.121-122]. Месца пражыванне князя і аўтара дзённіка – Слуцк (ён перайшоў да Радзівіллаў пасля шлюбу Соф'і Алелькавіч з Янушам Радзівілам): туды з Варшавы накіроўваліся 200 драгун, што супраўаджалі князя у дорозе да Варшавы, са Слуцка прыходзілі лісты [6, л. 18]. Руплівасць, з якой вяліся запісы (дзённы рэестр падзей звычайна ўтрымлівае некалькі, да 9 пунктаў), сведчыць аб увазе да будзёных падзей чалавечага жыцця, што робіць іх падзейна істотнымі. Таксама гэта – сведчанне досыць напружанага графіка жыцця, яго падзейнай насычанасці, якая рупліва фіксавалася – напрыклад, запісы з чацьверга 12 студзеня па панядзелак, 19 чэрвеня, вяліся кожны дзень. Адзначым, што сярод адзначаных аўтарам падзей разам занатаваня шматлікія, сістэматычныя ўзгадванні пра справы князя, афіцыйныя падзеі і, таксама, асабістыя справы аўтара – сустрэчы, бяседы, наведванні касцёлаў, атрыманне і напісанне лістоў, грашовыя справы, месцы начлега, інш., што сведчыць пра індывідуалізацыю светаўспрымання. У сухой канстатацыі падзей, што складае аснову дзённіка, сустракаюцца пачуццёвыя моманты, якія звязаныя з эмацыянальнымі нагрузкамі: после паведамлення аб размове з маскоўскімі пасламі 24 сакавіка у пятніцу ў Варшаве адзначаецца, што гэта доўжылася цэлы дзень, бясконца [6, л. 9]; красавік, пятніца, 28, – у Варшаве "сядзелі доўга ў начы ў Сенатарскай палаце" [6, л. 13]. Смерці, хваробы, вяселлі знаёмых, спрэчкі, злачычнства канстатуюцца з аднолькавай сухой аб'ектыўнасцю: май, 31 серада — прыехаў пасланец ад вельмі хворага пана; чэрвень, субота, 10 – прыйшоў ліст ад яснавельможэнага пана падкаморнага Хелмінскага, у якім ён запрашае на пахаванне жонкі; май, аўторак, 30 – прыйшло ў лісце паведамленне аб смерці пана Зеньковіча [6, л. 18]; люты,

нядзеля, 22 – быў на вяселлі [6, арк. 1]; красавік, чацьвер, 27 – нецьвярозы пан Твардоўскі пасварыўся с панам старастам Лукомскім і асуджаў яго, параўноўваючы з жанчынай [6, л. 13]; рейтар скраў пяць каней [6, л. 8], інш. Такім жы чынам паведамляецца і аб значных грамадскіх падзеях: красавік, 8, субота — у Варшаве кароль з набліжанымі і ўсім дваром наведаў пахаванні, працэсія ішла дзень і ноч по вуліцам і касцёлам; пасля гэтага адзначаецца, што быў урачыста адзначаны "трыумф" у Маскве ўзвышэння панскага [6, л. 10]. Гаворка можа ісці аб падзеях 1605 г., звязаных з панаваннем у Масковіі Лжэдзімітрыя ці, хутчэй, 1610 г. – бітвай пад Клушынам, узяццем Масквы гетманам Станіславам Жалкеўскім.

Застольная бяседа ў той час на нашых землях, як і ў Еўропе, была месцам вырашэння дзелавых пытанняў, яна часта ўзгадваецца ў мемуарах. Добры стан пасля бяседы з пітвом, а таксама наведвання гасцей звычайна канстатаваўся – аўтар адзначаў, што ўсе былі ў "добрым разуменні" (dobrej mysli) [6, л. 5, 18]. Аб характары правядзення тагачасных грамадска-палітычных акцый, сведчаць запісы, якія тычацца сейміка ў Мінске: аўторак, 31 студзеня – вырашаліся вайсковыя справы, потым "меў у сябе" на абедзе мясцовае панства; 1 лютага, ў сераду, "Князь, Яго Міласць" прымаў у сябе на абедзе паноў Мінскага ваяводства; 2 лютага князь прымаў розных людзей у сябе на абедзе [6, л. 2]. Увогуле, сярод застолій узгадываюцца ў асноўным абеды, якія даваліся знатнымі асобамі і мелі, як можна меркаваць, адносна афіцыйны характар; радзей узгадваецца вячэра, напрыклад, у Мінску [6, л.2], якая, верагодна, была ў большай ступені прыватнай падзеяй. Гэта адпавядае вядомаму ў XVIII ст. характару бясед якія падзялаліся на званыя, прыватныя [4, с. 29].

У мемуарах, дыярыюшах XVII ст. асабістыя адносіны праяўляюцца да падзей, якія маюць непасрэднае дачыненне да аўтара. Гэта тычыцца штодзённых запісаў польскамоўнага ананімнага дзённіка з радзівілаўскага фонду, падзеі якога датуюцца 1726 г. і прысвечаны паездцы ў Карону [7, арк. 51-52]. Іх аўтар уваходзіў у княжацкую світу, запісы адрознівае індывідуальная адзнака падзей, эмацыянальна-аксіялагічная афарбоўка: аўтар апісвае іх з пункту гледжання добрага ці дрэннага выніку для сябе. Адначасова гэтыя запісы – сведчанне аб тагачаснай бытавой культуры, адносінаў да гасцей. Так, кажучы аб начлезе ў Люкоўзе, аўтар скардзіўся, што пан Падлеўскі не дазволіў спаць у ізбе, прымушаючы спаць на зямлі (на вуліцы), а розныя слугі называлі аўтара марнатраўцам [7, арк. 51]. У Варшаве ў пакоі княжскага палаца, дзе казалі, што дадуць пасцель, людзі на трэцяй частцы пакою ляжалі скопам, у кутах пад сталом, аўтару ад гаспадароў добрага слова не было, слугі на пытанні дзе то ці іншае, адказывалі, каб шукаў сам [7, арк. 51].

У XVIII ст. з'явіліся дыярыўшы, дзе, акрамя дэталёвай фіксацыі дзённых падзей, меліся разважанні, нават выказвання інтымных пачуццяў (М. Матушэвіча, С. Маскевіча), іх змест, у значнай ступені, – гісторыя суб'екета, яго эмацыянальна, інтэллектуальна рэфлексаванага падзейнага жыцця. Аднымі з адносна новых па светаўспрыманню мемуараў з'яўляецца дыярыюш Рафаіла Слізня (1774-1779, 1794-1795 гг.), дзе аўтар эмацыянальна ацэньвае падзеі, разважае аб жыццёвых праблемах [3, с.121]. Дзённік дае ўяўленне аб тыпе бытавых паводзін заможнага шляхціца. Згодна з традыцыямі таго часу, Р.Слізень сітэматычна чытаў французскія кніжкі, пісаў лісты, дыярыюш, аб чым скурпулёзна паведамляў у нататках, дзень без чытання спецыяльна адзначаўся ў дзённіку. "Калі быць прыўдзівым, дык на пісанне лістоў уходзіць дастаткова часу", – сведчыў ён [8, л. 4]. Паказальна, што Р.Слізень, хаця і не прызначаў дыярыюш для шырокага чытача, друка, выражаў надзею аб тым, што яго будуць чытаць: у датаваных 1774 г. дзённых нататках ён апісваў, як да абеду "бавіўся" чытаннем, пісаў дзённік "... хіба калі чытаць які нехта будзе..." [8, л. 4]. Сярод модных заняткаў таго часу абавязковай была гульня ў карты, якая адымала шмат часу. Увогуле, распарадак дня быў адносна ўстойлівы: уставаў Р. Слізень а гадзіне шостай ці а палове сёмага, ішоў у капліцу, потым чытаў, займаўся хатнімі справамі, пісаў лісты, іншым разам прымаў гасцей ці хадзіў у госці, клаўся спаць а гадзіне дзясятай, перад сном чытаў. Як і ў дыярыюшах папярэдняга часу, эмацыянальная афарбоўка праяўлалася ў назіраннях надвор'я: "Дзень ясны, цёплы" [8, л. 6].

Прынцыпова супрацьлеглы тып светаўспрымання і паводзін прадстаўлены пастаццю праваслаўнага дзеяча А. Філіповіча, які пакінуў складзены ў 1645-1647 гг. так званы "Дыярыюш" – звод разнастайных, у тым ліку і мемуарных, але пераважна публіцыстычных твораў. Барочны, звязаны з рэлігійнай экзальтацыйнасцю характар аўтара праяўляецца ў яго самаідэнтыфікацыі, якая спалучала месіянства і самапрыніжэнне, арыентацыі на частыя відзёжы, бачанні рэлігійнага, апакаліпсічнага характару, барочнай па вобразнасці роллю аўтара "...на высоким театрум света того…» [9, с. 202]. У кантэксце дынамічнай эпохі была і яго прасторавая, сацыяльная мабільнасць – ён наведаў землі нашы, украінскія, польскія, Маскоўскай дзяржавы; А. Філіповіч размаўляў з

маскоўскім царом, быў на Варшаўскіх вальных сеймах, жыў у манастырах, трымаўся зняволеным у Варшаве і Кіеве і г д.

**Заключэнне**. Прадстаўленыя помнікі мемуарнай літаратуры сведчаць аб існаванні разнастыйных гісторыка-бытавых тыпаў на беларускіх землях XVII-XVIII ст., спецыфіка якіх звязана з характарам дзейнасці іх прадстаўнікоў. Дынаміка светаўспрымання людзей той эпохі вызначалася нарастаючай увагай да фіксацыі падзей, імкненнем да іх аксіялагічнай, пачуццёвай характарыстык. Разам з тым, асабісты, эмацыянальны аспект праяўлення ацэнкі навакольнага свету ў істотнай ступені залежыў ад характара занятка, тэмперамента чалавека (А. Філіповіч). Срод новых рысаў быту, адзначаных у мемуарах, эпахальным еўрапейскім тэндэнцыям XVIII ст. адпавядаюць прыхільнасць шляхты да чытання, напісання лістоў і дзённікаў, значная роля бяседы ў грамадскім жыцці, ухіл у забаўляльныя формы быта, першаю чаргу – гульню ў карты. Разнастайныя формы быта ўтрымлівалі стылёва-эпахальныя, пераважна барочныя праявы.

Спіс літаратуры


1. Блок, Марк. Апология истории или ремесло историка. Перевод Е.М. Лысенко. Примечания А.Я. Гуревича / Марк Блок. – М.: Наука. – 232 с.
2. Мальдзіс, Адам. Як жылі нашы продкі ў XVIII стагоддзі / Адам Мальдзіс.– Мн.: Лімарыус, 2001.– 384 с.
3. Вуглік, І. Р. Прыватныя запісы XVII-XVIII стст. як рэпрэзентанты характэрных рыс быту і культуры беларусаў (новыя матэрыялы і аспекты)/ І. Р. Вуглік // Весці БДПУ. – Серыя 2. Гісторыя. Філасофія. Паліталогія. Сацыялогія. Эканоміка. Культуралогія. – 2006. – № 2. – С. 120-123.
4. Вуглік, І.Р. Матэрыяльная культура і быт старабеларускай шляхты XVII-XVIII ст.Вучэбна-метадычны дапаможнік / І.Р.Вуглік. – Мн.: ЗАТ “Современные знанія”, 1985. – 84 с.
5. Angyal, Endre. Swiat slowianskiego baroku / Endre Angyal. – Warszawa: Panstwowy Instytut Wydawniczy. – 1972. – 498 с.
6. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Г. Мінск. – Радзивиллы, князья. Фрагменты дневниковых записей. – Фонд. 694. – Оп. 1.– Ед. 147.
7. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Г. Мінск. – Мемуары князей Радзивиллов. – Фонд 694. – Оп. 1. – Ед. 241.
8. Нацыянальны гістарычны архіў Рэспублікі Беларусь. Г. Гродна. – Дневник Рафаила Слизня за 1774-1779 и 1794-1795 гг. – Фонд. 1663. – Оп. 1. – Ед.. 14.
9. Из истории философской и общественно-политической мысли Белоруссии. Избранные произведения XVI- начала XIX в. /Под общ. ред. В.А. Сербента и др. – Мн.: Издательство Академии наук БССР, 1962. – С. 194-206.



Ігар Рыгоравіч Вуглік, кандыдат гістарычных навук, дацэнт, дацэнт кафедры культуралогіі Прыватнай установы адукацыі “Інстытут сучасных ведаў імя А.М. Шырокава”, вучоны сакратар Савета інстытута.

220012, г. Мінск, в. Сурганава, д. 21, кв. 37. Т. 80295730014, 3318034 х.